ЭЛЬКІНД.

## ОСО ў Б. Дз. У.

Адказам працоўных мас С.С.С.Р.на памятную ноту Кэрзона было ўтварэньне дабрахвотных таварыств, мэта якіх – акавваць матар'яльную і іншую дапамогу Чырвонай Арміі падрыхтоўка да абароны ў выпадку ваеннай інтэрвэнцыі.

Пролетарскае студэнцтва СССР хутка адгукнулася на заклік савецкай грамадзкасці. У Б. Д. У. былі арганізаваны ячэйкі „ОДВФ“ і „Добрахім“. Праца гэтых ячэяк у тэрмін 1923—1926 т. г. заключалася ў уцягненьні новых сяброў, зьбіраньні сяброўскіх узносаў. Практычнай працы ваенізацыі не праводзілася. Паралелізм у працы двух таварыств „ОДВФ“ і „Доброхім“, якія ставілі перад сабой адну мэту абароны краіны, адбіўся на працы ячэяк у Б. Д. У. у сэньое непрадукцыйнасьці.

Пасьля зьліяньня, зноў арганізаваўшаяся ячэйка „Добрахім“ налічвала 180 сяброў, сярод якіх значна паглыбілася праца, пачалі працу гурткі і хімкаманды. Побач з разгортваючайся працай Авіахіму ўзрастала праца ячэйкі ОСО, якая мела ў сваім распараджэньні стралковыя гурткі, гурткі вайсковых ведаў, навуковыя гурткі і г. д. З пачатку працы ячэйка ОСО налічвала 90 сяброў, але праца ОСО праводзілася сярод усёй масы студэнцтва.

У пачатку 1927 году зьліліся таварыствы Добрахім і ОСО ў адно—Осоавіахім Новая ячэйка ў Б. Д. У. адразу налічвае 406 чал. И фактычна толькі з гэтага часу праца ваенізацыі была накіравана па належнай плыні. Да 1927 году праца мела характар бальшасьцю „Компанейский“. У гэтым жа годзе мы маем у Б. Д. У. стройную арганізацыю ячэяк Осоавіахіму па ўсім факультэтам і на 1-ае лістапада лік сяброў узрос больш чым на 100 проц.—876 чал. Гэта паказвае што студэнцтва ўявіла сабе задачы абароны. Усяго мы маем у БДУ 5 ячэяк (на Мэдфаку, Пэдфаку, Праўгасу, Рабфаку і пры мясцкоме супрацаўнікоў).

Агульнае кіраўніцтва працай сканцэнтравана ў бюро, пры якім, працуюць 7 сэкцый: ваеннасанітарная, ваенна-палявой хірургіі, стралкова—тактычная, вайсковай зброі, дзьве ваенна -хімічныя і артылерыйская. Гурткоў налічваецца—26, у якіх працуюць 404 студэнты. Заняткі гурткоў праводзяцца па пляну нясупынна. Частка працы праведзена пад кіраўніцтвам прафэсуры.

У параўнаньні з агульным лікам студнцтва ячэйка яшчэ колькасна малая, але працай сваёй яна ахапіла большую частку студэнтаў. Аб гэтым сьведчаць вечары і экскурсіі ў якіх прыймаюць удзел студэнты не сябры ОСО.

Ячэйка цесна зьвязана з акруговым саветам ОСО. Навакол ячэйкі маецца актыў з 103 чалавек. Дасягненьнем ячэйкі зьяўляецца ўцягненьне ў працу жанчын. Ваенна-санітарныя курсы складаюцца амаль што поўнасьцю з студэнтак.

Заняткі праводзяцца ў ціры, прапускная здольнасць якога яшчэ малая і ў гэтым годзе ён будзе пашыраны.